*Вядучая рубрыкі — Надзея БУНЦЭВІЧ*

## Віншуем!*



**Рэктарат, калектыў супрацоўнікаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў сардэчна віншуюць дэкана факультэта завочнага навучання, кандыдата філасофскіх навук, дацэнта Антона Іванавіча Марэцкага са значнай падзеяй — 75-годдзем з дня нараджэння.**

Сваю шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць Антон Іванавіч прысвяціў студэнцтву. За 35 гадоў працы на пасадзе дэкана факультэта завочнага навучання вядучай ВНУ ў галіне культуры і мастацтва ўдала выявіў свой дбайны талент арганізатара навучальнага працэсу, больш за дваццаць гадоў з'яўляўся адказным сакратаром прыёмнай камісіі. Дзякуючы шчодрасці яго душы, клапатлівасці і ўважліваму стаўленню да маладога пакалення тысячы таленавітых спецыялістаў папоўнілі шэрагі беларускай нацыянальнай культуры ў розных яе галінах народнай творчасці, тэатральным, харэаграфічным і песенным мастацтве, кнігазнаўстве і бібліятэчнай справе.

У асобе Антона Іванавіча Марэцкага гарманічна спалучаюцца рысы філосафа і педагога, прафесійнага арганізатара вышэйшай школы.

Аб вяршынях яго дасягненняў сведчаць шматлікія ўзнагароды. За шматгадовую і плённую дзейнасць, інавацыйны ўклад у падрыхтоўку і выхаванне высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва неаднаразова адзначаўся Ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, міністэрстваў культуры і адукацыі.

**Дарагі Антон Іванавіч!**
**Прыміце самыя шчырыя віншаванні з пажаданнямі Вам добрага здароўя і доўгіх гадоў сумеснай дзейнасці на карысць нашай Радзімы Беларусі.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ